# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ПОЛИТИЧЕСКИХ И ПРАВОВЫХ НАУК

**К. Абуховіч**

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ ІДЭАЛОГІІ ТАТАЛІТАРЫЗМУ Ў XXI СТАГОДДЗІ: ПРЫЧЫНЫ І НАСТУПСТВЫ

Нягледзячы на жорсткую крытыку культаў Сталіна і Гітлера ў свой час, таталітарызм працягвае існаваць у сучасным свеце. Старая канцэпцыя таталітарызму стала неэффектыўнай з-за недастатковага тэхналагічнага развіцця і, як следства, немагчымасці рэалізаваць поўны кантроль над насельніцтвам. Гэта рэзка супярэчыла ідэі існавання таталітарнага рэжыму як адзінага цэлага.

Неататалітарны рэжым захоўвае прыкметы таталітарнага рэжыму, але магчымасць існавання неататалітарных рэжымаў улады абумоўлена, па-першае, пашырэннем уплыву тэхналогій на паўсядзённае жыццё: распаўсюджванне СМІ, радыё, тэлебачання, сродкаў сувязі; новыя навуковыя і тэхнічныя дасягненні – напрыклад, ядзерная зброя, – і такім чынам пашырэнне прапаганды таталітарыстычнай ідэалогіі; па-другое, схільнасцю сучасных дыктатараў да ідэі негвалтоўнага прымусу, то бок выкарыстоўванне псіхалагічных метадаў уплыву на свядомасць народа. Галоўная прычына існавання неататалітарызму – здольнасць выдатна функцыянаваць ва ўмовах палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай непастаяннасці свету з-за магчымасці хутка і эфектыўна мабілізаваць свае рэсурсы, як следства – зацікаўленасць народа ў пошуку лідара, які створыць зладжаны механізм кіравання і патэнцыяльна забяспечыць больш ці менш стабільную будучыню. Варта адзначыць, што лідар, у сваю чаргу, мае патрэбу ў масавай нізавой падтрымцы, і такім чынам ствараецца палітычны сімбіёз. Дадатковай прычынай існавання дадзенага рэжыму ўлады з’яўляецца люмпенізацыя грамадства, абсентэізм і палітычная недасведчанасць народа, немагчымасць аб’ектыўна ацэньваць знешнюю і ўнутраную палітыку дзяржавы. Прыкладам сучаснай неататалітарнай дзяржавы можа быць КНДР, хоць, па розных мерках, гэта ці таталітарны камунізм з рысамі нацыяналізму, ці нават камуністычная манархія з культам асобы.

Праблемай з’яўляецца лёгкасць пераходу ад аўтарытарнага да таталітарнага рэжыму ўлады. Таму захоўваюцца магчымасці для ўзнаўлення новых таталітарных дзяржаў з аўтарытарных, што можа прывесці да падзей мінулага стагоддзя, узмоцненых развіццём тэхналогій.